Навукова-метадычны часопіс
Выходзіць 1 раз у 2 месяцы
Выдаецца з 1997 г. (да 2011 г. пад назвай
«Гісторыя: праблемы выкладання»)
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку
масавай інфармацыі ад 25.04.2011 № 1440,
выдадзенае Міністэрствам інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

# Гісторыя і грамадазнаўства

№ 3 (117) 2023
Май — чэрвень

**Заснавальнік і выдавец — рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

Вул. Будзённага, 21,
220070, г. Мінск;
факс: 257-91-49;
http://www.aiv.by; aiv@aiv.by;
тэл.: 270-47-20 (галоўны рэдактар);
378-93-18 (адк. сакратар);
379-93-23 (аддзел маркетынгу);
e-mail: history@aiv.by



РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**Аляксандр Аляксандравіч Корзюк** — галоўны рэдактар, кандыдат педагагічных навук, дацэнт
**Д. Г. Ларыёнаў** — намеснік галоўнага рэдактара, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта БДУ
**Л. Б. Сопат** — адказны сакратар
**М. І. Міпіцкі** — доктар гістарычных навук, прафесар
**А. М. Мох** — кандыдат гістарычных навук
**І. Ю. Нікіціна** — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт
**П. А. Трубчык** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**В. М. Варановіч**
**Н. Ф. Някрэвіч**

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

**М. І. Вішнеўскі**, доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь
**В. А. Капранава**, доктар педагагічных навук, прафесар
**А. А. Каваленя**, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь
**Г. У. Карзенка**, доктар гістарычных навук, прафесар
**У. С. Кошалеў**, доктар гістарычных навук, прафесар
**П. Р. Мартысюк**, доктар філасофскіх навук, доктар культуралогіі, дацэнт (старшыня)
**А. В. Пазняк**, доктар педагагічных навук, прафесар
**К. У. Шаўчэнка**, доктар гістарычных навук, дацэнт

Падпісвайцеся
на тэлеграм-канал
выдавецтва
«Адукацыя і выхаванне»!
aivbooks

**Часопіс «Гісторыя і грамадазнаўства» ўключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання дысертацыйных даследаванняў, зацверджаны Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь.**

УДК 94(476) 1921/1939

# Актывісты беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі: спроба калектыўнай біяграфіі

*А. С. Горны,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы

**Анатацыя.** *У артыкуле ўпершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы зроблена спроба распрацоўкі калектыўнай біяграфіі актывістаў беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Аўтар зрабіў акцэнт на такіх крытэрыях калектыўнай біяграфіі, як далучэнне актывістаў да беларускага руху, іх прафесійная характарыстыка, сацыяльнае становішча, узрост, узровень адукацыі, канфесійная прыналежнасць. Важным крытэрам з'яўляецца праблема адаптацыі ці неадаптацыі актывістаў у польскае грамадства міжваеннага перыяду. У высновах падкрэсліваецца тэзіс аб развіцці масавага беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы.*

**Summary.** *The author made an attempt to develop a collective biography of the figures of the Belarusian national movement in the interwar Western Belarus for the first time in the national historical science. He singled out the criterion of a collective biography, showed the professional qualities of Belarusian activists, social status, age, level of education, religious affiliation. An important criterion is the problem of adaptation or non-adaptation of activists in Polish society of the interwar period. The thesis about the development of a mass Belarusian national movement of the population in interwar Poland is put forward.*

**Ключавыя словы:** *беларускі нацыянальны рух, Заходняя Беларусь, міжваенная Польшча, палітычная дзейнасць, прасапаграфія, калектыўная біяграфія.*

**Keywords:** *Belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, political activity, prosopography, collective biography.*

Выкарыстанне прасапаграфічнага метада і стварэнне калектыўных біяграфій пэўных сацыяльных груп пастунова займае важнае месца ў сучасным беларускім гістарычным дыскурсе. Назапашванне вялікай колькасці біяграфічнага матэрыялу, адкрыццё новых эга-дакументаў і архіўных крыніц дае магчымасць сучасным даследчыкам пераключыцца ад вывучэння аднаго вядомага чалавека да аналізу пэўнага калектыву малавядомых людзей, сацыяльнай групы, якая мела падобныя характарыстыкі і правілы паводзін. Факусіраванне інтарэса даследчыка менавіта на калектыве дазволіць знайсці адказы на многія метадалагічныя і тэарэтычныя пытанні: «Які ўплыў мела пэўная група людзей, аб'яднаных нейкімі агульнымі ідэямі ці мэтамі, на грамадства ў цэлым? Якія агульныя траекторыі паводзін выпрацоўвалі прадстаўнікі гэтай групы? Чаму людзі далучаліся да гэтай групы ці, наадварот, выходзілі з яе? Ці з'яўлялася група людзей моцнай кагортай аднадумцаў, ці суполкай па інтарэсах са слабымі сацыяльнымі сувязямі?»



pawet.net

Мэтай артыкула з'яўляецца спроба раскрыць асноўныя элементы калектыўнай біяграфіі вялікай сацыяльнай групы ў Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду — актывістаў беларускага нацыянальнага руху. Выкарыстанне гэтага падыхода дазволіць вызначыць іх уплыў на развіццё нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў у Польшчы, узняць навуковае пытанне аб масавасці беларускага нацыянальнага руху ў міжваенны перыяд.

Пасля заключэння Рыжскага міру ў 1921 г. заходнебеларускія землі сталі часткай Польскай дзяржавы. Улады гэтай краіны разгарнулі комплексную палітыку па нацыянальнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Адказам на гэта стаў уздым сярод беларусаў нацыянальнага руху, які суправаджаўся з'яўленнем новых арганізацый, новых форм працы з людзьмі на розных сацыяльных узроўнях, фарміраваннем вялікай групы актывістаў. Пад актывістамі беларускага руху тут разумеюцца ў першую чаргу людзі, якія з'яўляліся дзейнымі сябрамі беларускіх палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый розных плыняў, альбо якія пашыралі нацыянальную ідэнтычнасць праз арганізацыю мерапрыемстваў, распаўсюджванне друкаваных матэрыялаў і г. д., знаходзячыся па-за арганізацыйнай структурай. Аналіз гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі праз прызму прасапаграфічнага метада раней не выкарыстоўваўся ў айчыннай ці замежнай гістарыяграфіі, што дазваляе значна пашырыць межы біяграфічных даследаванняў, якія праводзіліся раней*.

Асобным даследчыцкім полем пры складанні калектыўнай біяграфіі актывістаў можа быць праблема іх далучэння да нацыянальнага руху, праблема «ўваходу» ў грамадскую дзейнасць. Як вядома, палітычнае развіццё беларускага нацыянальнага праекта пачалося ў пачатку XX ст. яшчэ ва ўмовах Расійскай імперыі, што прадвызначыла фарміраванне ў міжваеннай Польшчы цэлай плеяды дзеячаў з багатым арганізацыйным вопытам работы. Пасля заключэння Рыжскага міру ў Заходняй Беларусі працягнулі сваю грамадскую і палітычную дзейнасць некаторыя ветэраны беларускага руху, якія далучыліся да яго яшчэ ў «нашаніўскі перыяд» ці нават раней.

Сярод іх можна назваць А. Луцкевіча, Ф. Умястоўскага, А. Уласава, П. Аляксюка, М. Шылу, А. Зенюка і інш. [1, с. 273–274]. Пэўную частку ветэранаў руху складалі актывісты, якія далучыліся да палітычнай дзейнасці ў часы фарміравання розных форм беларускай дзяржаўнасці, пераважна ў 1917–1920 гг. У асноўным гэта былі людзі, якія працавалі ў структурах БНР, ССРБ ці Літоўска-Беларускай ССР: А. Аўсяннік, М. Каханoвіч, Ф. Ярэміч, В. Рагуля, Я. Шпаркевіч, А. Канчэўскі і інш.

Асаблівасцю «ветэрана» было тое, што ў большасці сваёй гэтыя людзі займалі пэўныя кіруючыя пасады ў нацыянальных арганізацыях розных накірункаў, з'яўляліся партыйнымі лідарамі, ажыццяўляючы сваю дзейнасць пераважна ў Вільні. Тым не менш, сустракаліся прыклады грамадскай дзейнасці «ветэранаў» і ў правінцыйных асяродках беларускага руху. Прыкладам тут можа быць асоба Навума Козіча — аднаго з сябраў Цэнтральнай Беларускай вайсковай рады ў 1917 г., удзельніка 1-га Усебеларускага з'езда, старшыні бежанскай камісіі Рады БНР, які ў міжваенны перыяд арганізоўваў гурткі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), Таварыства беларускай школы (ТБШ) і беларускія кааператывы на тэрыторыі Гродзенскага павета [1, с. 67].

Наяўнасць дасведчанага лідарскага актыву прадвызначыла арганізацыю ў Заходняй Беларусі шэрагу буйных палітычных акцый, якія сталі падставай для далучэння да беларускага руху вялікай колькасці новых грамадскіх дзеячаў.

*Гістарыяграфія беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі мае значны задзел у галіне біяграфій асобных грамадска-палітычных і культурных дзеячаў. Падрыхтаваны навуковыя біяграфіі Б. Тарашкевіча, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, П. Аляксюка, А. Уласава, І. Дварчаніна і інш. Гл., напр.: *Місарэвіч, Я.*, *Каралёў*. М. С. Дварчанін: гісторыка-біяграфічны нарыс. — Гродна, 1995; *Бергман, А.* Слова пра Браніслава Тарашкевіча. — Мінск, 1996; *Чарнякевіч, А.* Чужы сярод чужых: Павел Аляксюк і беларускія «паланафілы». — Мінск, 2017

Сярод падобных акцый неабходна ў першую чаргу вылучыць выбарчую кампанію ў польскі парламент 1922 г., якая значна пашырыла вертыкальныя і гарызантальныя палітычныя сувязі беларускага насельніцтва, дала магчымасць стварыць першыя лакальныя структуры нацыянальнага руху. Таксама важнае значэнне мелі кампанія па адкрыцці беларускіх школ у 1924–1926 гг. і агітацыйная акцыя БСРГ у 1926 г. Усе гэтыя мерапрыемствы абуджалі ў насельніцтва цікавасць да нацыянальнай ідэнтычнасці, давалі магчымасць распаўсюджваць прэсу, кнігі, лістоўкі, што ў сваю чаргу прыводзіла ў шэрагі актывістаў новых людзей. У прыватнасці, вядомы пісьменнік П. Пестрак узгадваў, што менавіта знаёмства з беларускамоўнай газетай у сярэдзіне 1920-х гг. абудзіла яго нацыянальную свядомасць і стала прычынай далучэння да дзейнасці беларускіх арганізацый [2, с. 142]. Немалаважную ролю ў прыцягненні новых актывістаў адыгрывалі ўстановы сярэдняй адукацыі — беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі, выпускнікі якіх у большасці сваёй уступалі ў шэрагі розных нацыянальных арганізацый.

Таму невыпадкова ў міжваеннай Заходняй Беларусі беларускі рух, які ва ўмовах іншай дзяржаўнасці выступаў спадкаемцам дарэвалюцыйных традыцый барацьбы за нацыянальную ідэнтычнасць, перайшоў у статус масавага палітычнага руху. Да нацыянальнай справы далучаліся людзі розных прафесійных занядкаў, у першую чаргу настаўнікі, юрысты, медыкі, а таксама святары, навучэнцы, былыя афіцэры царскай арміі. Актывізавалася і сялянства, якое мела перавагу сярод прафесійных груп беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі.

Асабліва масава рэкрутаванне сялян у нацыянальны рух пачалося ў сярэдзіне 1920-х гг., што звязана, з аднаго боку, з усплёскам дзейнасці БСРГ і Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), а з другога — з непапулярнай эканамічнай і нацыянальнай палітыкай польскіх уладаў. У гуртках БСРГ прысутнасць сялян была наўпрост дамінуючай. Паводле сведчанняў сакратара Цэнтральнага сакратарыяту БСРГ М. Бурсевіча з усёй колькасці сябраў арганізацыі 85 % былі сяляне, аднак у кіраўнічых структурах Грамады на лідарскім узроўні палова актывістаў па прафесійных характарыстыках адносілася да інтэлігенцыі [3, с. 554]. Сяляне з'яўляліся асноўнай масай членаў і яшчэ адной левaрадыкальнай беларускай арганізацыі — КПЗБ. Нягледзячы на тое, што па ўсіх праграмных і ідэалагічных параметрах гэтая партыя павінна была дзейнічаць у асноўным у рабочым прафесійным асяроддзі, большасць яе актыву была земляробамі [4, арк. 13 адв.].

Па маёмасных характарыстыках сяляне, якія былі актывістамі, у сваёй большасці не належалі да заможнай праслойкі сельскіх жыхароў. Сярод 33 актывістаў беларускіх арганізацый у Жухавіцкай гміне Стаўбцоўскага павета, якіх зафіксавала мясцовая паліцыя, у большасці ва ўласнасці было толькі ад 1,5 да 5 га зямлі. Некаторыя дзялілі гэтую зямлю з бацькамі ці братамі, што яшчэ больш пагаршала іх маёмасны стан. Сустракаліся, аднак, сярод жухавіцкіх дзеячаў і больш заможныя гаспадары. Так, кіраўнік гуртка ТБШ у в. Хлюпічы Жухавіцкай гміны Ілля Шут валодаў 10 га зямлі, а кіраўнік раённага камітэта КПЗБ у Малых Жухавічах Канстанцін Корзан меў гаспадарку на 12 га зямлі [5, арк. 1–193]. Для параўнання, адна сям'я польскага асадніка ў Навагрудскім ваяводстве магла мець ад 15 да 45 га зямлі [6, с. 26].

Пашырэнне беларускага руху на сялянскае асяроддзе ў Заходняй Беларусі і яго выхад з уласнай зоны «канфорту» сталі магчымым, у тым ліку дзякуючы дзейнасці вясковай і гарадской інтэлігенцыі. Як падкрэсліў польскі сацыёлаг С. Віславух, які ў міжваенны перыяд праводзіў анкетаванне насельніцтва паўночна-ўсходніх ваяводстваў Польшчы, кожная вёска, што мела ўласную беларускую інтэлігенцыю, дастаткова свядома і варожа ставілася да польскай дзяржаўнасці [7, с. 97]. Пры гэтым у міжваенны перыяд пашыраецца прафесійная характарыстыка інтэлігентаў: цяпер гэта ўжо не толькі пераважна

настаўнікі ці журналісты. Напрыклад, у 1920-я гг. у Лідскім павеце сярод беларускага актыву сустракаюцца фельчары, канцылярскія служачыя, чыгуначнікі і інш. [8, арк. 184, 207, 340 адв.–341].

Недаацэненай у айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца роля праваслаўных святароў у пашырэнні і ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў у міжваеннай Польшчы. Можна сцвярджаць, што значная колькасць праваслаўнага духавенства і псаломшчыкаў прынамсі спачувала беларускаму нацыянальнаму руху, а некаторыя з іх адкрыта ў ім удзельнічалі, разумеючы яго як адзін са сродкаў барацьбы з паланізацыяй [1, с. 131, 256]. Паралельна з гэтым, у міжваенны перыяд у нацыянальным руху ў розных формах прымалі ўдзел каля 50–60 каталіцкіх святароў, якія імкнуліся ўмацаваць беларускую ідэнтычнасць сваёй паствы [9, s. XXXII]. Таксама ў нацыянальную дзейнасць было ангажавана сем уніяцкіх святароў і некалькі пратэстанцкіх пастараў, аднак у асноўным іх актывізм абмяжоўваўся распаўсюджваннем сярод вернікаў рэлігійных выданняў на беларускай мове [9, s. 89, 98, 138, 215, 276, 290, 301, 320, 327].

Узроставая характарыстыка нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі мела сваю пэўную дынаміку ў розныя перыяды і залежала ад той ці іншай палітычнай плыні альбо ад лідарскага ці правінцыйнага ўзроўня. У кіруючых структурах беларускіх арганізацый, якія размяшчаліся ў Вільні ў 1920-я гг., працавала значная колькасць сталых дзеячаў узростам ад 30 да 50 гадоў, маючых вялікі вопыт работы. Так, у 1926 г. у склад віленскага Беларускага нацыянальнага камітэта — адной з галоўных каардынуючых арганізацый беларусаў у Польшчы — уваходзілі Антон Луцкевіч (42 гады), Браніслаў Тарашкевіч (34 гады), Сымон Рак-Міхайлоўскі (41 год), Фабіян Ярэміч (35 гадоў), Аляксандр Уласаў (52 гады), Вячаслаў Багдановіч (48 гадоў), Адам Станкевіч (34 гады) і інш. [1, с. 274].

Аднак на рубяжы 1920–1930-х гг. у віленскіх структурах адбываецца паступовая змена генерацыі — на кіраўнічыя пасады прыходзяць маладыя людзі, якія з'яўляліся выпускнікамі беларускіх гімназій ці мелі за плячыма дыплом польскіх ці чэхаславацкіх універсітэтаў. У 1930-я гг. ветэраны беларускага руху, якія засталіся ў Заходняй Беларусі, пачыналі паступова адыходзіць ад актыўнай дзейнасці, замяняючы палітычны актывізм на працу па пашырэнні культуры і адукацыі.

На правінцыйным узроўні прыход маладога пакалення актывістаў таксама быў відавочным. У першую чаргу звернем увагу на леварадыкальную плынь як на найбольш масавую ў беларускім руху. У пачатку 1920-х гг. да дзейнасці нелегальнай КПЗБ далучаліся людзі маладога і сярэдняга ўзросту, многія з якіх нарадзіліся яшчэ ў XIX ст.

Для правядзення аналізу ў гэтым накірунку выкарыстаем мікрагістарычны падыход. У 1925 г. у Малабераставіцкай гміне Гродзенскага павета польскай паліцыяй была зафіксавана дзейнасць 14 актывістаў КПЗБ. Найбольш сталым з гэтай групы быў 39-гадовы Антон Сіцько, наймаладзейшай — 18-гадовая Надзея Давыдзік. Сярэдні ўзрост усёй групы актывістаў — 28 гадоў [10, арк. 24 адв.]. На 1928 г. узрост найбольш актыўных беларускіх дзеячаў з Лідскага павета ўвогуле вагаўся ад 28 да 44 гадоў, у асноўным гэта былі дарослыя 30-гадовыя мужчыны [11, арк. 224–225]. Невыключана, што такая сітуацыя была характэрна для іншых рэгіёнаў Заходняй Беларусі.

Да дзейнасці беларускіх структур у пачатку 1920-х гг. далучаліся ўжо свядомыя людзі з пэўным жыццёвым вопытам, якім польская ўлада не забяспечвала гарантаваныя заканадаўствам нацыянальныя і сацыяльныя правы. Акрамя гэтага для многіх з іх быў свежым у памяці ранейшы левы радыкалізм — нехта меў кантакты з камуністамі ў часы бежанства ці грамадзянскай вайны, нехта з'яўляўся былым сябрам партыі беларускіх эсэраў.

Зніжэнне ўзроставай характарыстыкі нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі пачалося ўжо ў перыяд існавання БСРГ у 1926–1927 гг. Гэты палітычны праект даў магчымасць далучыцца да беларускай дзейнасці вялікай колькасці людзей з гарадоў і вёсак, у тым ліку і шматлікай сялянскай моладзі. Для доказу гэтага

факта прывядзём выбарку сябраў аднаго гуртка БСРГ, які дзейнічаў у в. Варацішча Нясвіжскага павета. У гуртку было 12 сялян, у паловы з якіх узрост вагаўся ад 19 да 22 гадоў [12, арк. 64–74]. Нам невядома іх ступень ангажаванасці ў дзейнасць партыі, аднак сам факт таго, што яны паставілі свае подпісы пад партыйнымі дакументамі азначае іх згоду і разуменне ўдзелу ў нацыянальна арыентаванай справе.

У 1930-я гг. працэс «амалажэння» левaрадыкальнай плыні беларускага руху ў Заходняй Беларусі працягваўся. У дакументах польскай паліцыі намі былі выяўлены 7 актыўных дзеячаў слонімскага раённага камітэта КПЗБ, асобы якіх былі вызначаны паліцэйскімі ў 1930 г. Самаму старэйшаму з іх Авакуму Ёршу з в. Шылавічы было 27 гадоў, самаму малодшаму — Аляксандру Герасімчыку з в. Васілевічы — 17 гадоў. Сярэдні ўзрост гэтай групы актывістаў у параўнанні з прыведзенымі вышэй звесткамі за 1920-я гг., знізіўся да 22,5 гадоў [13, арк. 19, 21]. Падобная сітуацыя назіралася і ў суседнім Стаўбцоўскім павеце. Тут сярэдні ўзрост кіраўнікоў пяці вясковых ячэек КПЗБ на 1930 г. складаў таксама 22 гады [13, арк. 22 адв]. У Маладзечанскім павеце на 1931 г. сярэдні ўзрост актывістаў КПЗБ быў не на шмат вышэйшы — 24 гады [14, арк. 17–18]. Сярод іх ужо былі людзі, якія нарадзіліся літаральна незадоўга да Першай сусветнай вайны, г. зн. іх дзіцячыя гады, пачатак сацыялізацыі, школьная адукацыя прыпадалі на ваенныя часы, бежанства і першыя гады знаходжання беларускіх земляў у складзе Польшчы.

Аднак не толькі ваенныя пертурбацыі дзяцінства сталі прычынай іх далучэння да палітычнай дзейнасці. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывала палітыка польскіх уладаў па асіміляцыіі беларусаў, якая ўзмацнілася ў 1930-я гг. У многіх рэгіёнах Заходняй Беларусі прадстаўнікі ўлады, польскія землеўласнікі, асаднікі, інтэлігенцыя, кіруючыся ўстаноўкамі паланізацыі, лічылі беларусаў людзьмі другога гатунку, што вельмі востра адчувалі падлеткі і маладыя людзі. Адсутнасць адукацыі на зразумелай роднай мове прыводзіла іх да разрыву сувязяў са школай, пераходу да самаадукацыі і далучэнню да дзейнасці нацыянальных структур, у якіх яны чулі роднае слова і маглі на ім безперашкодна размаўляць. Яшчэ адным фактарам рэкрутацыі актывістаў у КПЗБ мог быць сусветны эканамічны крызіс, які закрануў Польшчу на рубяжы 1920–1930-х гг. і стварыў для моладзі неспрыяльныя ўмовы для рэалізацыі жыццёвай траекторыі.

Вызначаецца сваёй асаблівасцю канфесійны аспект калектыўнай біяграфіі актывістаў. У тагачасным традыцыйным беларускім грамадстве з дэфармаванай ці няўстойлівай нацыянальнай свядомасцю канфесійная прыналежнасць часам адыгрывала важную ролю ў фарміраванні ідэнтычнасці і вылучэнні «сваіх» і «чужых». Аналізуючы вялікую колькасць эмпірычнага матэрыялу, можна прыйсці да высновы, што ў пераважнай большасці актывіст беларускага руху ў Заходняй Беларусі быў праваслаўным. У якасці прыкладу прывядзём даныя затрыманых польскай паліцыяй у 1934 г. дэлегатаў на з'езд ТБШ. Сярод 27 актывістаў гэтай арганізацыі з розных рэгіёнаў Заходняй Беларусі толькі два чалавекі былі каталікамі [15, арк. 103–104 адв.].

Польская паліцыя нярэдка ў сваіх справаздачах падкрэслівала, што, напрыклад, на тэрыторыі Гродзеншчыны ці Лідчыны мясцовае праваслаўнае насельніцтва актыўна спачувала беларускаму руху ў адрозненні ад каталіцкага, якое падтрымлівала ўладу і дастаткова прыхільна ставілася да польскіх чыноўнікаў і асаднікаў [8, арк. 416]. Гэтая з'ява магла тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае, праваслаўныя беларусы больш моцна адчувалі сваю «інакшасць» дзякуючы рэлігійнаму фактару, чым католікі, якія з'яўляліся прадстаўнікамі галоўнай дзяржаўнай канфесіі. Па-другое, дзякуючы «канфесійнай» паланізацыі, мясцовыя католікі былі вельмі цесна звязаны з польскім культурным дыскурсам, што адштурхоўвала іх ад прыняцця беларускай ідэнтычнасці. Аднак падобныя характарыстыкі адзначаліся не ва ўсіх заходнебеларускіх рэгіёнах.

Неабходна заўважыць, што ў міжваеннай Заходняй Беларусі былі мясцовасці,

дзе каталіцкае насельніцтва актыўна падтрымлівала беларускі нацыянальны рух. У першую чаргу гэта паўночны захад сучаснай Беларусі (паўночная частка Гродзенскай вобласці, заходняя частка Віцебскай вобласці) і паўднёва-ўсходняя частка Літвы, дзе кампактна пражывалі беларусы. Таксама ачагі беларускай ідэнтычнасці сярод католікаў можна было заўважыць у тагачасных Баранавіцкім, Ваўкавыскім, Беластоцкім і Сакольскім паветах. На гэтых землях значную асветніцкую і культурную дзейнасць праводзілі беларускамоўныя ксяндзы, што пакінула пэўны след у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці тутэйшых жыхароў. Большасць актывістаў-католікаў з гэтых рэгіёнаў належала да арганізацый нацыянальна-дэмакратычнай плыні — Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), Беларускага сялянскага саюза (БСС) і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК). Іх лакальныя структуры найбольш былі пашыраны менавіта на адзначаных тэрыторыях [16, с. 17]. Таму ўдзел каталіцкай моладзі ў дзейнасці левáрадыкальных структур там быў мінімальным. У той жа час актывісты-католікі, якія дзейнічалі ў левáрадыкальных структурах (КПЗБ, ТБШ), з большага паходзілі якраз з паўночнага захаду Беларусі (напрыклад, Я. Бабровіч, К. Чартовіч, Ю. Саковіч ці В. Склубоўскі).

Значным крытэрам у правядзенні прасапаграфічнага аналізу актывістаў у міжваеннай Заходняй Беларусі з'яўляецца ўзровень адукацыі. Польскі сацыёлаг С. Віславух, праводзячы вывучэнне стану нацыянальнай свядомасці жыхароў усходніх крэсаў у міжваенны перыяд, заўважыў, што узровень беларускай самасвядомасці вышэй у тых мясцовасцях, дзе ёсць людзі з нясконачанай сярэдняй, сярэдняй ці вышэйшай адукацыяй. Ён прывёў прыклад вёскі Скрышава Навагрудскага павета, дзе некалькі былых навучэнцаў Навагрудскай беларускай гімназіі, якія не скончылі поўны гімназічны курс па прычыне закрыцця ўстановы, з'яўляліся сапраўднымі лідарамі мясцовай грамадскай думкі [7, с. 96].

Тым не менш, не заўсёды наяўнасць таго ці іншага ўзроўню адукацыі магла сведчыць пра актыўны ўдзел чалавека ў нацыянальным руху, ступень развіцця яго нацыянальнай эмансіпацыі і адкрытасці да нацыянальна-дзяржаўнага праекту. Да падобнай высновы можна прыйсці, прааналізаваўшы адукацыйны ўзровень левáрадыкальных актывістаў з Жухавіцкай гміны Стаўбцоўскага павета, звязаных са структурамі БСРГ, ТБШ і КПЗБ у розныя часы. Сярод выбраных намі 33 актывістаў, якія жылі ў двух-трох суседніх вёсках пазначанай вышэй гміны, толькі чатыры чалавекі мелі нясконачаную сярэднюю ці сярэднюю адукацыю. Заўважым, што гэта былі навучэнцы беларускіх гімназій (Віленскай і Клецкай), сярод адзначаных актывістаў не было ніводнага вучня польскай сярэдняй установы адукацыі.

Адзін з пераліку — Аляксандр Юшко — пасля заканчэння Віленскай беларускай гімназіі нелегальна пераехаў у Чэхаславакію, там атрымаў вышэйшую адукацыю і застаўся жыць, таму ніякай асаблівай ролі на развіццё нацыянальных працэсаў на радзіме ён не аказваў. У сямі беларускіх дзеячаў з Жухавіцкай гміны была хатняя адукацыя, адукацыйны ўзровень астатніх 22 чалавек вагаўся ў межах 2–5 класаў пачатковай польскай школы ці школы часоў Расійскай імперыі. Цікавай акалічнасцю з'яўляецца тое, што найбольш актыўныя дзеячы беларускага руху Жухавіцкай гміны, у прыватнасці сакратар гуртка ТБШ у Малых Жухавічах і арганізатар аматарскіх пастановак С. Мамончык альбо старшыня гуртка ТБШ у Хлюпічах І. Ясевіч, мелі ўсяго толькі хатнюю адукацыю [5, арк. 1–193]. Гэта не перашкодзіла ім стаць лідарамі думак у сваёй мясцовасці і арганізатарамі культурна-асветніцкага жыцця.

Трэба прызнаць, што беларускія дзеячы, якія мелі вышэйшую адукацыю, асабліва прадстаўнікі маладой генерацыі, былі здольныя стаць у пэўнай мясцовасці сапраўднымі грамадскімі лідарамі, мелі рэсурсы для распаўсюджвання беларускай ідэнтычнасці і праяўлялі ў гэтым ініцыятыву. Прыкладам гэтага можа быць значная плеяда беларусаў — выпускнікоў чэхаславацкіх вышэйшых навучальных

устаноў, якія ў канцы 1920 — пачатку 1930-х гг. вярнуліся ў Заходнюю Беларусь (В. Грышкевіч, М. Ільяшэвіч, А. Клімовіч, М. Гузоўскі, В. Лаўскі, М. Гарошка, П. Орса і інш.) [17, с. 68, 84, 127, 156, 168, 283]. Некаторыя з іх, апынуўшыся на сваёй малой радзіме, сталі сапраўдным «цэнтрам прыцягнення», якія падтрымлівалі і распаўсюджвалі беларускую ідэнтычнасць, стваралі розныя беларускія ініцыятывы. Так, Мікалай Гарошка пасля вучобы ў Чэхаславакіі вярнуўся ў вёску Трашчычы Стаўбцоўскага павета, дзе ў 1930-я гг. разгарнуў сапраўдную грамадскую актыўнасць. Пры яго ўдзеле ў навакольных вёсках было закладзена некалькі беларускіх кааператываў, распаўсюджваліся нацыянальныя кніжныя і перыядычныя выданні, у саміх Трашчычах планавалася арганізаваць нават кааператыўныя курсы [18, арк. 43.].

Малавядомай ініцыятывай актывістаў была спроба стварэння Таварыства беларусаў — выпускнікоў ВНУ. У 1934 г. быў складзены праект статута гэтай арганізацыі, дзе вызначалася яе мэта — аб'яднаць беларусаў з вышэйшай адукацыяй для прафесійнага распаўсюджвання нацыянальнай духоўнай і матэрыяльнай культуры ў Заходняй Беларусі. Планавалася, што таварыства будзе садзейнічаць арганізацыі на лакальным узроўні розных лекцый, семінараў, прэзентацый кніг, распаўсюджваць беларускую літаратуру і падручнікі. Праект статута падпісалі як выпускнікі польскіх, так і чэшскіх ВНУ: В. Лаўскі, Н. Орса, А. Орса, Б. Грабінскі, Б. Кіт, М. Гузоўскі і інш. Аднак рэалізаваць гэты праект у будучыні так і не ўдалося, верагодна, з-за адмоўнай пазіцыі польскіх уладаў [18, арк. 72–75].

Наяўнасць вышэйшай адукацыі магла стаць прычынай развіцця іншых жыццёвых траекторый для актывістаў. Многія з тых, хто ў міжваенны перыяд атрымаў універстэцкія дыпломы, пераязджалі ў Вільню і ўключаліся ў дзейнасць кіруючых структур нацыянальных арганізацый. Прыкладам такога можа быць абноўлены склад Цэнтральнага камітэта Беларускага народнага аб'яднання (былой БХД), зацверджаны ў 1936 г., у якім прысутнічалі маладыя дзеячы з розных заходнебеларускіх рэгіёнаў, адносна нядаўна атрымаўшыя вышэйшую адукацыю (А. Клімовіч, Я. Малецкі, Я. Шутовіч, А. Дасюкевіч і інш.) [19, s. 198]. Грамадская праца ў Вільні ў шмат чым адцягвала гэтых людзей ад сваіх родных мясцін і змяншала іх сувязі з правінцыйнымі асяродкамі.

З другога боку вышэйшая адукацыя магла прывесці да хутчэйшай адаптацыі актывіста ў польскае грамадства, стаць фактарам пэўнага разрыву сувязяў з нацыянальна-вызваленчым рухам. Атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, маладыя людзі, асабліва выпускнікі польскіх універсітэтаў, атрымлівалі і першае месца працы, што прымушала іх звяртаць больш увагі на паўсядзённыя патрэбы, чым на грамадскі актывізм. У 1929 г. выпускнік медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта, адзін з лідараў БХД і беларускага студэнцкага руху І. Гагалінскі атрымаў пасаду кіраўніка павятовага шпіталя ў Кобрыне [20]. Пасля гэтага яго імя як актыўнага і перспектыўнага дзеяча больш не згадвалася ў наяўных крыніцах. Падобная сітуацыя была і ў біяграфіі паэта і грамадскага дзеяча А. Бартуля. З'яўляючыся актыўным ўдзельнікам беларускіх студэнцкіх арганізацый, аўтарам многіх літаратурных выданняў на рубяжы 1920–1930-х гг., Бартуль пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта распачаў юрыдычную кар'еру ў розных судовых установах міжваеннай Польшчы, што значна зменшыла яго дзейнасць у рамках нацыянальнага руху [21, с. 404].

Важным элементам калектыўнай біяграфіі дзеячаў з'яўляецца іх адаптацыя ці прыстасоўванне ў польскае грамадства і «жыццё пасля актывізму». Рэпрэсіі з боку польскіх уладаў прыводзілі да ліквідацыі розных легальных арганізацый, турэмнага пераследу тысяч актывістаў, што было значным фактарам адмовы многіх з іх у далейшым працягваць дзейнасць у нацыянальным руху. Пастаянныя расколы і цэнтрабежныя тэндэнцыі, якія праяўляліся сярод беларусаў у Заходняй Беларусі з канца 1920-х гг. не прыводзілі да значных перамог і поспехаў, што таксама не матывавала быць унутры гэтага руху.

У рэшце рэшт паўсядзённыя патрэбы людзей таксама накладвалі адбітак на гэтыя працэсы — актывістам руху неабходна было мець сталую працу, карміць свае сем'і, атрымліваць адукацыю, таму гэта непазбежна штурхала іх да ўзаемадзеяння з польскімі грамадскімі і дзяржаўнымі ўстановамі.

Адсутнасць жадання далей удзельнічаць у дзейнасці беларускіх структур у большасці выпадкаў была звязана з рэпрэсіямі з боку польскіх уладаў. Мясцовая адміністрацыя, як і варшаўскае кіраўніцтва, разглядалі любую праяву нацыянальнага руху праз прызму камуністычнай антыдзяржаўнай дзейнасці, што асабліва ўзмацнілася пасля ліквідацыі БСРГ у 1927 г. Таму лакальныя дзеячы заўсёды знаходзіліся пад пільным наглядам спецслужбаў і пры любой магчымасці маглі быць затрыманы і абвінавачаны ў падрыўной рабоце супраць Польшчы. Гэтая акалічнасць падцвярджаецца тым фактам, што польскія турмы былі перапоўнены палітзняволенымі беларусамі. Так, на люты 1929 г. толькі ў Гродзенскай турме знаходзілася 175 актывістаў левaрадыкальных арганізацый, большасць з якіх мела беларускае паходжанне [22, арк. 304].

Многія людзі не вытрымлівалі падобных умоваў пастаяннага пераследу і рабілі выбар не на карысць актыўнасці. Добрым адлюстраваннем такой сітуацыі з'яўляюцца жыццёвыя шляхі двух актывістаў, якія жылі ў абсалютна розных рэгіёнах Заходняй Беларусі. Першы з іх, Міхаіл Нікіфароўскі з вёскі Празарокі Дзісненскага павета (цяпер Глыбоцкі раён), з'яўляўся былым афіцэрам царскай арміі, які ў пачатку 1920-х гг. стаў беларускім дзеячам у сваёй мясцовасці. У перыяд дзейнасці БСРГ ён быў лідарам дзісненскага павятовага камітэта гэтай партыі і пад час яе ліквідацыі быў арыштаваны польскімі ўладамі. Пасля вызвалення ў канцы 1920-х гг., знаходзячыся ў вельмі цяжкім матэрыяльным становішчы і маючы праблемы са здароўем, Нікіфароўскі дыстанцыянаваўся ад нацыянальнага руху і пачаў пісаць карэспандэнцыі для польскамоўнай газеты «Кур'ер віленскі» [23].

Другі дзеяч — Міхаіл Васілеўскі — пражываў у Пінску, у пачатку 1920-х гг. з'яўляўся мясцовым карэспандэнтам беларускіх газет. У перыяд дзейнасці БСРГ ён быў адным з лідараў беларускага руху ў горадзе, кіраваў пінскім аддзелам Беларускага кааператыўнага банка. Пасля вызвалення з Лукішскай турмы ў канцы 1920-х гг. Васілеўскі больш не прымаў актыўнага ўдзелу ў нацыянальнай дзейнасці, пачаўшы жыць жыццём звычайнага польскага абывацеля: працаваў клеркам у крэдытным кааператыве, увайшоў у склад мясцовага аддзела польскай грамадскай арганізацыі Лігі супрацьпаветранай абароны. Пры гэтым у Пінску на той час яшчэ засталіся структуры беларускага руху, дзе мог спатрэбіцца вопыт Васілеўскага — гурток ТБШ і сакратарыят Беларускага пасольскага клуба «Змаганне» [24, арк. 2]. Гэтыя дзве біяграфіі яскрава паказваюць, наколькі неабаснаваныя рэпрэсіі з боку польскіх уладаў звужалі магчымасці нацыянальнага праекта, не давалі разгарнуць свой грамадскі патэнцыял людзям, якія ў першую чаргу жадалі займацца культурна-асветніцкай дзейнасцю.

З іншага боку, значная частка актывістаў, нягледзячы на польскія рэпрэсіі, працягвала займацца беларускай справай літаральна да канца 1930-х гг., змяняючы толькі формы сваёй працы ў адпаведнасці з сітуацыяй. Актывіст Пётр Мышко са Скідзельскай гміны ў 1928 г. з'яўляўся агітатарам беларускіх левaрадыкальных спісаў пад час выбараў у парламент. Прайшоўшы турэмныя краты, ён не спыніў свайго ўдзелу ў нацыянальным руху — у 1930-я гг. дасылаў паштоўкі ў рэдакцыю часопіса «Калоссе» з мэтай набыць нумары выдання для распаўсюджвання [25, арк. 38]. У той жа самы час і ў тую ж рэдакцыю даслаў паштоўку нейкі Мікалай Селівончык з в. Люшнева Баранавіцкага павета, які адсядзеў 44 месяцы ў турме Вронкі па абвінавачванню ў антыдзяржаўнай дзейнасці, што не перашкодзіла яму пасля вызвалення адразу звярнуцца да рэдакцыі беларускага выдання з просьбай даслаць яго [25, арк. 48].

Польская турма не спыніла і Антона Семашкевіча, кіраўніка гуртка БІГіК у вёсцы Малая Боркаўшчына Маладзечанскага павета: пасля вызвалення ён актыўна заняўся арганізацыяй беларускіх спектакляў і канцэртаў у сваёй мясцовасці [26, арк. 169]. Як бачна, гэтыя людзі канчаткова не парывалі сувязяў з нацыянальнай справай, аднак змянялі сферу сваёй актыўнасці на больш памяркоўную, што сведчыла аб арганізацыйным крызісе беларускага руху ў 1930-х гг. пад уздзеяннем рэпрэсій з боку польскіх уладаў.

Страх перад магчымасцю аказацца ў польскай турме і звужэнне легальнага поля дзейнасці вымушалі многіх дзеячаў займацца пэўнай мімікрыяй — далучацца да польскіх арганізацый і праз іх пашыраць беларускую самасвядомасць без негатыўных наступстваў для сябе. Так, калі ў 1928 г. у нацыянальным руху назіраліся крызісныя з'явы пасля рэпрэсій адносна БСРГ, многія правінцыйныя актывісты, якія раней належалі да беларускіх структур, пад час выбарчай кампаніі ў польскі парламент пачалі далучацца да дзейнасці праўрадавага Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з уладамі (ББСУ).

Падобны працэс, напрыклад, меў месца ў Берштаўскай гміне Гродзенскага павета, дзе ва ўтвораны гмінны камітэт ББСУ ўвайшлі беларусы М. Касцевіч, А. Сініла і інш. Пры гэтым, як аказалася пазней, Касцевіч, карыстаючыся легальнасцю, агітаваў зусім не за ББСУ, а за беларускі левaрадыкальны спіс [27, с. 238–239]. У в. Дакудава Лідскага павета ў студзені 1928 г. адбыўся перадвыбарчы сход ББСУ, пасля якога ў вёсцы ўтварыўся гмінны камітэт гэтай праўрадавай арганізацыі. Сакратаром камітэта стаў Сяргей Кудзі, які, як сцвярджалася ў рапарце мясцовай паліцыі, раней з'яўляўся старшынёй дакудаўскага гуртка БСРГ [28, арк. 37 адв.]. Аднак у снежні 1928 г. гэты дзеяч фігураваў у спісе небяспечных беларускіх актывістаў Лідскага павета, якіх у выпадку ваенных дзеянняў трэба было затрымаць [11, арк. 224].

Найбольш актыўна грамадскай мімікрыяй карысталася правінцыйная беларуская моладзь у 1930-х гг. У гэты перыяд ва ўмовах адсутнасці разгалінаванай сеткі легальных структур нацыянальнага руху, якая была фактычна знішчана польскімі ўладамі, мясцовыя актывісты пачалі выкарыстоўваць магчымасці легальных моладзевых польскіх арганізацый для пашырэння беларускай свядомасці. Напрыклад, многія маладыя людзі ў вёсках Заходняй Беларусі належалі да гурткоў польскага «Саюза вясковай моладзі», у рамках якіх яны ладзілі сцэнічныя аматарскія пастаноўкі на беларускай мове. Як сцвярджаў адзін з карэспандэнтаў віленскага часопіса «Шлях моладзі», беларусы мелі жаданне і чакалі спрыяльных умоваў, кабператварыць гурткі польскага «Саюза вясковай моладзі» ў беларускую культурна-асветніцкую арганізацыю [29]. Паказальна, што ў некаторых мясцовасцях нават прадстаўнікі нелегальнай КПЗБ заклікалі сваіх аднапартыйцаў пранікаць у польскія грамадскія ці дзяржаўныя ўстановы, мець прыязныя стасункі з чыноўнікамі, каб уплываць на працэсы ўнутры польскага грамадскага арганізма [30, арк. 87].

Падводзячы вынікі прасапаграфічнага даследавання, можна сфарміраваць пэўны «калектыўны партрэт» актывіста беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. У сваёй большасці гэта былі маладыя людзі ва ўзроставым дыяпазоне ад 20 да 30 гадоў, які меў паступовую тэндэнцыю да зніжэння. Яны сталі актыўнымі дзеячамі дзякуючы шэрагу палітычных кампаній, якія адбыліся ў Заходняй Беларусі ў 1920-х гг., у прыватнасці, выбарчай кампаніі ў польскі парламент у 1922 г. Па сваёй прафесійнай характарыстыцы актывіст быў пераважна малазямельным селянінам, хаця ў дзейнасць беларускіх арганізацый было ангажавана і шмат інтэлігенцыі (настаўнікі, журналісты, святары, фельчары, юрысты, служачыя і г. д.), што адлюстроўвае ўмацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці на розных узроўнях сацыяльных адносін.

Адукацыйны ўзровень гэтага чалавека вагаўся ў рамках пачатковай ці сярэдняй адукацыі, што, аднак, не перашкаджала яму значна пашыраць свой адукацыйны ўзровень у хатніх умовах.

Наяўнасць актывістаў з вышэйшай адукацыяй уздымала аўтарытэт беларускага руху ў сельскім асяроддзі, стварала падставы для фарміравання новых формаў супрацоўніцтва з насельніцтвам на лакальным узроўні. Беларускі актывізм быў пашыраны пераважна ў праваслаўных супольнасцях Заходняй Беларусі: у міжваеннай Польшчы прыналежнасць да праваслаўя дазваляла актывістам яшчэ больш адчуваць сябе «іншымі». Пад уздзеяннем польскіх рэпрэсій частка дзеячаў разрывала сувязі з нацыянальнай дзейнасцю і рабілася звычайнымі польскімі абывацелямі, іншая частка спрабавала знайсці адпаведныя легальныя формы для працягу работы па пашырэнню беларускай ідэнтычнасці.

Прадстаўленыя высновы могуць прывесці да фарміравання некалькіх важных тэзісаў. Па-першае, калі ў міжваеннай БССР пашырэнне і ўмацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў было звязана з дзяржаўнымі структурамі (школа, вышэйшая адукацыя, адміністрацыя, культурна-асветніцкія ўстановы), то ў Заходняй Беларусі ва ўмовах іншай дзяржаўнасці гэтыя функцыі ўзялі на сябе шараговыя актывісты нацыянальнага руху. У шмат чым іх дзейнасць прывяла да таго, што нацыянальная ідэнтычнасць пачала ўмацоўвацца сярод найбольшай часткі беларускага соцыуму — сялянства, якое доўгі перыяд мела маргінальную этнічную самасвядомасць. Не будзе перабольшваннем той факт, што пры ўдзеле беларускага актыву ў Заходняй Беларусі ў вельмі цяжкіх умовах дзяржаўнай паланізацыі адбывалася канчатковае фарміраванне беларускага нацыянальнага праекта паралельна з тымі працэсамі, што праходзілі ў даваеннай БССР. Па-другое, феномен актывістаў у Заходняй Беларусі стаў прычынай фарміравання масавага палітычнага руху, у які былі ўцягнуты розныя сацыяльныя, прафесійныя, канфесійныя слаі тагачаснага грамадства.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Кароткі нарыс беларускага пытаньня / рэд., аўт. прадм.: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч. — Мінск : Логвінаў, 2009. — 395 с.
2. *Пестрак, П.* Дарогаю жыцця / П. Пестрак // Полымя. — 1959. — № 12. — С. 135–150.
3. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: документы и материалы / редкол. : В. И. Гурский [и др.]. — Минск : Госиздат БССР, 1962. — Т. 1 (1921–1929). — 620 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 242п, воп. 1, спр. 266.
5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). — Ф. 664, воп. 2, спр. 6.
6. *Полуян, В.* Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. Полуян, И. Полуян. — Минск : Госиздат БССР, 1962. — 224 с.
7. *Віславух, С.* Нацыянальныя адносіны на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў / С. Віславух // Arche. — 2018. — № 1. — С. 69–358.
8. ДАГВ. — Ф. 200, воп. 1, спр. 17.
9. *Garbiński, J.* Białoruski ruch chrześcijański XX wieku: słownik biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. — Warszawa, 2003. — 519 s.
10. ДАГВ. — Ф. 52, воп. 1, спр. 128.
11. ДАГВ. — Ф. 200, воп. 2, спр. 3.
12. НАРБ. — Ф. 882, воп. 1, спр. 36.
13. ДАГВ. — Ф. 551, воп. 1, спр. 1110.
14. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна (ЗДАМ). — Ф. 10, воп. 1, спр. 103.
15. ДАГВ. — Ф. 52, воп 1, спр. 98.
16. *Горны, А.* Рэгіянальныя структуры беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. Горны // Беларускі гістарычны часопіс. — 2021. — № 6. — С. 14–22.
17. Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (1918–1939) / уклад. А. Бучы. — Мінск : Кнігазбор, 2020. — 560 с.
18. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). — Ф. 1, воп. 9, спр. 814.

19. *Moroz, M.* "Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu / M. Moroz. — Białystok : BTH, 2001. — 230 s.
20. Z biełaruskaha žyćcia // Biełaruskaja Krynica. — 1929. — Nr. 22. — S. 2.
21. *Глагоўская, Л.* Аўген Бартуль на фоне польска-беларускіх адносінаў XX ст. / Л. Глагоўская // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча : зб. арт. па матэрыялах міжнар. навук. канф. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2018. — С. 391–417.
22. ДАГВ. — Ф. 55, воп. 1, спр. 101.
23. J. N. Ś. P. Michał Nikiforowski / J. N // Kurjer Wileński. — 1930. — Nr. 182. — S. 3.
24. ДАБВ. — Ф.1, воп. 2, спр. 2860.
25. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Аддзел рэкіх кніг і рукапісаў. — Ф. 23, воп. 1, спр. 442.
26. НАРБ. — Ф. 880, воп. 1, спр. 10.
27. *Токць, С.* Беларуская вёска ў эпоху зменаў: другая палова XIX — першая траціна XX ст. / С. Токць. — Мінск : Тэхналогія, 2007. — 308 с.
28. ДАГВ. — Ф. 200, воп. 2, спр. 14.
29. Госьць. Польскія «Колы» ладзяць беларускія прадстаўленні / Госьць // Шлях моладзі. — 1934. — № 6. — С. 19.
30. ЗДАМ. — Ф. 10, воп. 1, спр. 77.

*Дата поступления материала 05.04.2023.*

УДК 94 (47+57) "1920/1940"

# Политика советского государства по организации снабжения трудовыми ресурсами промышленности в 1920-х — начале 1940-х гг.

***В. А. Йоцюс,*** кандидат исторических наук, доцент, заведующий кафедрой всеобщей истории и методики преподавания истории Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка

**Аннотация.** *В статье рассматривается проблема формирования и реализации советской государственной политики по обеспечению промышленности трудовыми ресурсами в контексте борьбы с безработицей и аграрным перенаселением в БССР в 1920-х — начале 1940-х гг. Определены ключевые направления этой политики. На основе архивных материалов приведены данные о количестве переселенцев, проанализированы достижения и недостатки советской переселенческой политики.*

**Summary.** *The article deals with the problem of formation and implementation of the Soviet state policy on the organization providing industry with labor resources in the context of combating unemployment and agrarian overpopulation in the BSSR in the 1920s — early 1940s. The main directions of this policy are defined. Based on archival materials, data on the number of displaced persons are presented, the achievements and shortcomings of the Soviet resettlement policy are analyzed.*

**Ключевые слова:** *БССР, трудовые ресурсы, индустриализация, безработица, организованный набор рабочей силы, промышленное переселение.*

**Keywords:** *BSSR, labor resources, industrialization, unemployment, organized recruitment of labor, industrial resettlement.*